УДК 37.012:005.336.2-057.86:796

**У. М. Старчанка**
**г. Гомель ГДУ імя Ф. Скарыны**

# ДЫЯГНАСТЫЧНЫ ІНСТРУМЕНТАРЫЙ ДЛЯ ВЫМЯРЭННЯ ЎЗРОЎНЮ СФАРМІРАВАНАСЦІ ПРАФЕСІЙНЫХ УМЕННЯЎ ФІЗКУЛЬТУРНАГА ПЕДАГОГА

У артыкуле прад'яўлена структура прафесійнай культуры і дзейнасці фізкультурнага педагога, разгледжаны яго практычныя і інтэлектуальныя прафесійныя ўменні. На падставе тэарэтычных уяўленняў распрацавана і апрабавана сістэмная і метралагічна карэктная методыка дыягностыкі ўзроўню сфарміраванасці прафесійных уменняў фізкультурнага педагога.

Падрыхтоўка прафесійных кадраў для сферы фізічнай культуры і спорту прадугледжвае выкарыстанне ў адукацыйным працэсе дыягнастычнага інструментарыя, які дазваляе вызначаць узровень сфарміраванасці прафесійнай (квазіпрафесійнай) культуры педагога (студэнта). Прафесійная культура фізкультурнага педагога (ФП) уключае ў сябе: прафесійнае мысленне, патрэбасна-матывацыйна-каштоўнасную сферу, прафесійныя веды, прафесійныя ўменні і навыкі, фізічную падрыхтаванасць у педагагічнай дзейнасці [1; 2]. Аднак дыягнастычнага інструментарыя для вызначэння ўзроўню сфарміраванасці прафесійных уменняў ФП, які задавальняе прынцыпам сістэмнасці і метралагічнай карэктнасці, ў цяперашні час – няма.

Мэтай дадзенай працы з'яўлялася распрацоўка сістэмнага і метралагічна карэктнага дыягнастычнага інструментарыя для вызначэння ўзроўню сфарміраванасці прафесійных уменняў ФП. Распрацоўваючы дыягнастычны інструментарый, мы зыходзілі з таго, што прафесійныя ўменні і навыкі – гэта выпрацаваныя ў працэсе дзейнасці і даведзеныя да рознай ступені аўтаматызму спосабы ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці або яе асобных фрагментаў [3]. Пры гэтым мы абапіраліся на тэарэтычную мадэль прафесійнай дзейнасці педагога [4]. У адпаведнасці з ёй ФП ажыццяўляе наступныя віды дзейнасці:

– дэманструе ўзоры дзейнасці (узоры фізкультурных ведаў і мыслення, рухальных уменняў і навыкаў, фізічнай падрыхтаванасці);

– кантралюе параметры дзейнасці навучэнцаў і кантралюе ўнутраныя педагагічныя ўмовы вучэбнай дзейнасці;

– карэктуе параметры вучэбнай дзейнасці навучэнцаў і параметры ўнутраных педагагічных умоў вучэбнай дзейнасці;

– стварае аптымальныя ўмовы вучэбнай дзейнасці навучэнцаў (стварае сістэму штучных матываў вучэбнай дзейнасці, прадастаўляе навучэнцам вучэбна-метадычнае забеспячэнне вучэбнай дзейнасці, прадастаўляе аптымальныя матэрыяльна-тэхнічныя, гігіенічныя і арганізацыйна-кіраўніцкія ўмовы вучэбнай дзейнасці);

– арганізоўвае і падтрымлівае камунікацыю ў сістэме «педагог-навучэнцы».

У структуры прафесійнай дзейнасці ФП можна вылучыць практычныя і інтэлектуальныя ўменні.

Практычныя прафесійныя ўменні ФП фарміруюцца ў працэсе практычнай дзейнасці і выяўляюцца ў знешніх дзеяннях, якія можна непасрэдна назіраць. Да іх адносяцца:

– уменні слоўнай і візуальнай (перш за ўсё цялеснай) дэманстрацыі узораў дзейнасці якія падлягаюць капіраванню;

– уменні арганізацыйна-кіраўніцкага плана звязаныя з ажыццяўленнем як педагагічнага кантролю так і з карэкцыяй параметраў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў, з арганізацыяй аптымальных умоў вучэбнай дзейнасці;

– камунікатыўныя ўменні.

Інтэлектуальныя прафесійныя ўменні ФП ўключаюць у сябе аналітычныя, праектыўныя і рэфлексіўныя ўменні [5]. Прафесійныя ўменні выяўляюцца ў адпаведнай дзейнасці,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

таму методыка дыягностыкі ўзроўню іх сфарміраванасці прадугледжвае арганізацыю педагагічнага назірання. Улічваючы, што асноўнай формай фізічнага выхавання школьнікаў з'яўляецца ўрок, методыка прадугледжвае арганізацыю педагагічнага назірання за прафесійнай дзейнасцю ФП на ўроку фізкультуры і здароўя.

Мэтай правядзення дыягностыкі з'яўляецца вызначэнне ўзроўню сфарміраванасці прафесійных уменняў ФП. Аб'ект дыягностыкі – ФП абодвух палоў. Прадмет дыягностыкі – прафесійныя ўменні ФП. Сродкі дыягностыкі – пратакол педагагічнага назірання. Метады дыягностыкі: педагагічнае назіранне, экспертная ацэнка.

Пратакол педагагічнага назірання (малюнак) распрацаваны ў адпаведнасці са структурай і зместам прафесійных уменняў ФП.

У «шапцы» пратакола прыводзяцца звесткі аб педагогу, месцы і часу правядзення назірання.

У першай графе пратакола (прадметы назірання і ацэньвання) пералічаны асноўныя ўменні педагога. У другой графе выстаўляюцца адзнакі (вынікі ацэньвання прадметаў назірання).

У трэцяй графе пратакола (медыяна) выстаўляюцца вынікі назірання па кожнаму з пяці галоўных прадметаў ацэньвання.

Апошні радок пратакола (выніковая адзнака прафесійных уменняў (медыяна медыян)) прызначаны для выстаўлення выніковай (інтэгральнай) адзнакі, якая вызначае ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў ФП.

Якаснае выніковае ацэньванне ўзроўню сфарміраванасці прафесійных уменняў ФП ажыццяўляецца наступным чынам. Кожны прыватны прадмет назірання ацэньваецца экспертам з выкарыстаннем рангавай шкалы ад «0» да «3». Адзнака «0» азначае адсутнасць уменняў у дадзеным відзе дзейнасці, «1» сведчыць аб здавальняючым узроўні сфарміраванасці ўменняў, «2» – аб добрым узроўні сфарміраванасці ўменняў, «3» – аб выдатным узроўні. Медыяна атрыманых адзнак дае якасную ацэнку кожнага з вылучаных намі асноўных прадметаў назірання. У сваю чаргу, медыяна медыян дае якасную выніковую ацэнку ўзроўню сфарміраванасці прафесійных уменняў ФП. Медыяна – цэнтральны элемент урадкаванага шэрагу значэнняў. Напрыклад, у шэрагу: 1; 1,5; 2; 2; 2,5 медыяна = 2 [6].

Працэдура дыягностыкі прафесійных уменняў ФП ўключае некалькі этапаў.

На першым этапе эксперт праводзіць аналіз складзенага педагогам плана-канспекта ўрока, як у фармальным, так і сутнасным аспектах. Пры гэтым эксперт ацэньвае праектыўныя ўменні педагога і ў пратаколе назірання, у адпаведнай графе, ставіць адзнаку, якая характарызуе ўзровень сфарміраванасці праектыўных уменняў.

На другім этапе эксперт непасрэдна ажыццяўляе назіранне за прафесійнай дзейнасцю педагога (у адпаведнасці з планам-канспектам урока), ацэньвае ўвесь спектр прадметаў назірання, а вынікі ацэньвання заносіць у пратакол.

Трэці этап характарызуецца тым, што эксперт прапануе педагогу правесці самаацэнку асноўных відаў дзейнасці, ажыццёўленых на праведзеным ім ўроку (ацэньваюцца аналітыка-рэфлексіўныя ўменні педагога).

На завяршальным этапе эксперт выводзіць выніковую адзнаку, якая характарызуе ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў ФП ў цэлым (выкарыстоўваецца медыяна медыян). Прыклад прадстаўлены на малюнку 1.

Інтэрпрэтацыя атрыманага значэння медыяны медыян наступная:

0 – адсутнасць прафесійных уменняў; 0,5 – нездавальняючы ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў; 1 – здавальняючы ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў; 1,5 – амаль добры ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў; 2 – добры ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў; 2,5 – вельмі добры ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў; 3 – выдатны ўзровень сфарміраванасці прафесійных уменняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| Урок правёў: Клёмін А. М. Прафесійны стаж: 5 гадоў. Катэгорыя: 2.<br>Месца правядзення ўрока: спартыўная зала ДУА «СШ № 72 г. Гомеля»<br>Дата правядзення: 08.04.2021 г. | Адзнака (0…3) | Медыяна |
|---|---|---|
| **Прадметы назірання і ацэньвання** | | |
| **Інтэлектуальныя прафесійныя ўменні:** | | |
| **1 Праектыўныя ўменні** | | |
| Уменне складаць план-канспект урока ў фармальным аспекце (адпаведнасць задач урока дакументам планавання, пісьменнасць напісання і ахайнасць афармлення) | 2 | |
| Уменне складаць план-канспект урока ў сутнасным аспекце (адпаведнасць запланаваных заданняў задачам урока, магчымасць іх вырашэння з дапамогай гэтых заданняў, метадычная пісьменнасць) | 2 | 2 |
| **2 Аналітычныя і рэфлексіўныя ўменні:** | | |
| Уменні педагога аналізаваць сваю дзейнасць (самааналіз, рэфлексія праведзенага занятку) | 1 | 1 |
| **Практычныя прафесійныя ўменні:** | | |
| **3 Уменні дэманстраваць узоры дзейнасці, якія падлягаюць капіяванню** | | |
| Ўменні візуальнай (цялеснай) дэманстрацыі ўзораў рухальнай дзейнасці (тэхнікі выканання фізічных практыкаванняў) (частата і якасць дэманстрацыі) | 2 | |
| Уменні славеснай дэманстрацыі (частата і якасць славеснай дэманстрацыі пры тлумачэнні вучэбнага матэрыялу, пры карэкцыі вучэбнай дзейнасці, пры кіраванні класам...) | 1 | 1,5 |
| **4 Арганізацыйна-кіраўніцкія ўменні:** | | |
| Уменні ствараць, кантраляваць і карэктаваць параметры вучэбнай дзейнасці (перманентны кантроль і карэкцыя параметраў вучэбнай дзейнасці вучняў) | 2 | |
| Уменні ствараць, кантраляваць і карэктаваць параметры ўмоў вучэбнай дзейнасці (прадастаўляць навучэнцам вучэбна-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне вучэбнай дзейнасці) | 1 | 2 |
| Уменні матываваць (актывізаваць) вучэбную дзейнасць навучэнцаў | 2 | |
| **5 Камунікатыўныя ўменні:** | | |
| Уменне падтрымліваць вербальную і невербальную камунікацыю на занятку | 2 | |
| Уменне прытрымлівацца педагагічнага такту | 3 | 2,5 |
| **Выніковая адзнака прафесійных уменняў (медыяна медыян):** | | 2 |
| Назіранне і экспертную ацэнку правёў: С. А. Іваноў | | |

Малюнак 1 – Бланк пратаколу педагагічнага назірання за параметрамі прафесійнай дзейнасці ФП на ўроку (з прыкладам запаўнення)

Экспертнае заключэнне можа выглядаць наступным чынам.

*У выніку педагагічнага назірання ўстаноўлена, што:*

*– узровень сфарміраванасці праектыўных уменняў педагога «добры»;*

*– узровень сфарміраванасці аналітычных і рэфлексіўных уменняў «здавальняючы»;*

*– узровень сфарміраванасці ўменняў дэманстраваць узоры дзейнасці «амаль добры»;*

*– узровень сфармаванасці арганізацыйна-кіраўнічых уменняў «добры»;*

*– узровень сфарміраванасці камунікатыўных уменняў «амаль выдатны»;*

***– узровень сфарміраванасці прафесійных уменняў у цэлым «добры».***

*Рэкамендацыі педагогу.* Варта звярнуць увагу на ўдасканаленне ўменняў аналізаваць і рэфлексаваць сваю прафесійную дзейнасць. Таксама патрэбна ўдасканальваць ўменні, звязаныя са славеснай дэманстрацыяй (тэрміналагічная карэктнасць, даходлівасць…) узораў дзейнасці.

*Выснова*. Распрацаваная намі методыка дыягностыкі прафесійных уменняў фізкультурнага педагога з’яўляецца сістэмнай і метралагічна карэктнай. Яна апрабаваная на практыцы, мае высокую лагічную інфарматыўнасць, яе надзейнасць (узгодненасць) можа быць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

павышана шляхам павелічэння колькасці экспертаў. Прад'яўлены ў артыкуле дыягнастычны інструментарый можа быць выкарыстаны: а) пры праходжанні студэнтамі фізкультурных факультэтаў педагагічнай практыкі ў навучальных установах з мэтай вызначэння ўзроўню сфарміраванасці іх прафесійных уменняў; б) пры правядзенні навуковых даследаванняў; в) у практыцы работы інстытутаў развіцця адукацыі, на курсах павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў; г) у практыцы работы завучаў агульнаадукацыйных школ.

Спіс выкарыстаных крыніц


1 Старчанка, У. М. Структура і змест прафесійнай культуры спартыўнага педагога / У. М. Старчанка // Управление развитием образования в русле акмеологии : материалы Междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Н. В. Кухарев (отв. ред.) – Гомель : ГОИРО, 2009. – Вып. 11. – Ч. 4. – С. 44–47.

2 Старчанка, У. М. Тэарэтычная мадэль прафесійнай культуры фізкультурна-спартыўнага педагога / У. М. Старчанка // Проблемы физической культуры населения, проживающего в условиях неблагоприятных факторов окружающей среды : материалы IX Междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : О. М. Демиденко [и др.] : в 2 ч. – Гомель : ГГУ имени Ф. Скорины, 2011. – Ч. 1. – С 106–108.

3 Старченко, В. Н. Классификация профессиональных умений педагога / В. Н. Старченко // Актуальные проблемы физического воспитания, спорта и туризма : материалы V Междунар. науч.-практ. конф., Мозырь, 9–11 окт. 2014 г. / УО МГПУ им. И. П. Шамякина ; редкол. : С. М. Блоцкий (отв. ред.) [и др.]. – Мозырь, 2014. – С. 135–136.

4 Старченко, В. Н. Сущность, структура и содержание профессиональной полидеятельности современного педагога / В. Н. Старченко // Взаимодействие науки и практики в развитии инновационных процессов системы образования [Электронный ресурс] : материалы респ. науч.-практ. конф., Гомель, 28 ноября 2014 г.; редкол. : В. Л. Акуленко (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 2014. – С. 360–363.

5 Старченко, В. Н. Структура и содержание профессиональных умений физкультурно-спортивного педагога / В. Н. Старченко, А. Н. Метелица // Актуальные вопросы научно-методической и учебно-организационной работы: Подготовка специалиста в контексте современных тенденций в сфере высшего образования : материалы республиканской науч.-метод. конф. (Гомель, 13–14 марта 2014 года) : в 4 ч. - Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины, 2013. – Ч. 1. – С. 53–56.

6 Старчанка, У. М. Спартыўная метралогія : падручнік / У. М. Старчанка. – Мінск : РІВШ, 2021. – 368 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

УДК 37.015.324.2-053.4

**В. С. Тищенко, Е. Е. Кошман**
**г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины**

## ПРОБЛЕМЫ ГОТОВНОСТИ ДЕТЕЙ ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА К ШКОЛЕ

В статье рассматривается проблема готовности детей дошкольного возраста к школе. Выявлены и раскрыты компоненты готовности детей дошкольного возраста к школе: интеллектуальный, эмоционально-волевой, личностный, социально-психологический или коммуникативный, психомоторный.